# Савецкі дэмакратызм у дзеянні

*В. Казлоў,*
*старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР*

Беларускі народ, як і ўсе народы нашай краіны, у абстаноўцы велізарнага працоўнага і палітычнага ўздыму сустракае найвялікшую гістарычную падзею — XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, на якім будзе прынята грандыёзная праграма будаўніцтва камуністычнага грамадства. Апублікаваныя ў друку тэзісы даклада таварыша М. С. Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС, якія падводзяць вынікі слаўных перамог і раскрываюць велічныя перспектывы камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, атрымалі ўсеагульнае адабрэнне.

Камуністычная партыя кожны раз, калі перад краінай паўстаюць новыя задачы і патрабуецца знайсці найбольш правільнае вырашэнне важных праблем развіцця эканомікі, культурнага будаўніцтва, нязменна звяртаецца да мудрасці народа, да яго калектыўнага розуму. Гэта вынікае з самой прыроды Савецкай дзяржавы, дзе ўся паўната ўлады знаходзіцца ў руках народа — сапраўднага творца гісторыі.

Рабочы клас, сялянства, інтэлігенцыя актыўна ўдзельнічаюць у выпрацоўцы важнейшых законаў і ў іх ажыццяўленні. Перш чым прыняць пастанову па наспеўшых пытаннях, партыя і ўрад раюцца з народам. Дзесяткі мільёнаў савецкіх людзей абмяркоўвалі Дырэктывы па шостаму пяцігадоваму плану, праект Закона аб дзяржаўных пенсіях, пытанні перабудовы кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, рэарганізацыі МТС і далейшага развіцця калгаснага ладу. У краіне ідзе шырокае абмеркаванне праекта кантрольных лічбаў развіцця народнай гаспадаркі на 1959—1965 гады, абмяркаваны тэзісы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб умацаванні сувязі школ з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі. Савецкія людзі выказваюць свае прапановы і пажаданні. Гэта і ёсць сапраўдная дэмакратыя.

Сацыялістычны дэмакратызм арганічна ўласцівы савецкаму грамадскаму і дзяржаўнаму ладу. Сацыялізм нямыслім без дэмакратыі і перш за ўсё таму, што сацыялістычная дэмакратыя з'яўляецца карэннай і абавязковай умовай паспяховага вырашэння задач сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва.

У. І. Ленін яшчэ да рэвалюцыі ўказваў: «Нельга перамагчы капіталізм, не **ўзяўшы банкаў,** не адмяніўшы **прыватнай уласнасці** на сродкі вытворчасці, але нельга ажыццявіць гэтых рэвалюцыйных мер, не арганізуючы дэмакратычнае кіраванне захопленымі ў буржуазіі сродкамі вытворчасці ўсім народам, не прыцягваючы ўсёй масы працоўных, і пралетарыяў і паўпралетарыяў і дробных сялян, да дэмакратычнай арганізацыі сваіх радоў, сваіх сіл, свайго ўдзелу ў дзяржаве» (Т в о р ы, т. 23, с т а р. 13).

Наша краіна з'яўляецца радзімай сапраўднага народаўладдзя. Савецкая ўлада, якая ўсталявалася ў нас у выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, далучыла многамільённыя масы працоўных да актыўнага палітычнага жыцця, да непасрэднага і рашаючага ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. Савецкая дэмакратыя з'явілася той палітычнай формай, у рамках якой рабочы клас, усе працоўныя нашай краіны пабудавалі сацыялізм, дабіліся выдатных поспехаў у развіцці эканомікі і культуры і цяпер паспяхова вырашаюць задачы па ажыццяўленню пераходу ад сацыялізма да камунізма.

Буржуазны друк, платныя агенты буржуазіі трацяць нямала сіл на доказ «недэмакратычнасці» савецкага ладу, на ўсхваленне «заходняга

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

спосабу жыцця», «заходняй дэмакратыі». Але абаронцам наёмнага рабства, як бы яны ні стараліся, не ўдасца зацямніць праўду. Сутнасць любога грамадскага і дзяржаўнага ладу, сутнасць дэмакратыі заключаецца ў тым, які клас стаіць на чале ўлады і ў інтарэсах каго, большасці народа ці кучкі эксплуататараў, ён ажыццяўляе сваю палітыку. Зусім відавочна, што ў буржуазным грамадстве, расколатым на антаганістычныя класы, у грамадстве, дзе ўлада належыць эксплуататарскай меншасці, якая ўладае ўсімі сродкамі вытворчасці, сапраўднай дэмакратыі няма і не можа быць. Буржуазная дэмакратыя, як указваў У. І. Ленін, заўсёды з'яўлялася ўрэзанай, куцай, фальшывай, раем для багатых, пасткай для эксплуатуемых, для бедных, гэта значыць для велізарнай большасці народа.

Савецкая ўлада, як улада рабочых і сялян, знішчыла панаванне памешчыкаў і капіталістаў, вызваліла працоўных ад капіталістычнага рабства, стварыла ўсе ўмовы для шырокага ўдзелу працоўных у кіраванні дзяржавай, ва ўсіх галінах грамадска-палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця. Сутнасць Савецкай улады ў тым і заключаецца, што ўстанаўленне сапраўднай свабоды для народных мас, прыцягненне іх да шырокага ўдзелу ў грамадскім жыцці і кіраванні справамі дзяржавы з'яўляецца не толькі мэтаю, але і рашаючай умовай паспяховага будаўніцтва новага жыцця. Сама форма савецкай дзяржаўнай улады, якая зверху данізу складаецца з Саветаў дэпутатаў працоўных, выбіраемых усім насельніцтвам, найлепшым чынам адпавядае задачам шырокага прыцягнення мас да ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. У Саветах дэпутатаў працоўных, якія складаюць палітычную аснову СССР, увасоблены новыя адносіны паміж народнымі масамі і дзяржавай. Магутная сіла Саветаў, як гістарычна новых, сапраўды дэмакратычных дзяржаўных арганізацый, заключаецца ў тым, што яны назаўсёды знішчылі той бар'ер, які вякамі існаваў і існуе ў краінах капітала і адгароджвае дзяржаву ад народа.

Савецкі лад, народжаны вялікім Кастрычнікам, з гонарам вытрымаў выпрабаванне часам. Больш чым саракагадовы перыяд існавання нашай дзяржавы паказаў, што яна з'яўляецца сапраўды народнай, дае найшырэйшую прастору творчай актыўнасці мас і стварае такія магчымасці руху грамадства ўперад, аб якіх ні адна буржуазная дзяржава і марыць не можа. «Савецкая ўлада, — гаварыў У. І. Ленін, — ёсць шлях да сацыялізма, знойдзены масамі працоўных і таму — правільны і таму — непераможны» (Творы, т. 29, стр. 225).

Важнейшай крыніцай сілы савецкага ладу, асноўнай умовай яго паспяховага развіцця з'яўляецца кіраўніцтва Камуністычнай партыі. Наш народ беззапаветна верны сваёй роднай Камуністычнай партыі, арганізатару і натхніцелю ўсіх перамог савецкага народа і аднадушна падтрымлівае палітыку партыі, бо яна поўнасцю выражае яго карэнныя інтарэсы. Камуністычная партыя праяўляе нястомныя клопаты аб умацаванні і далейшым развіцці савецкага сацыялістычнага дэмакратызма, паляпшэнні дзейнасці Саветаў і ўмацаванні іх сувязей з шырокімі масамі працоўных. Партыя і народ, разграміўшы і адкінуўшы антыпартыйную групу Маленкова, Кагановіча, Молатава, Булганіна і Шэпілава, згуртаваліся яшчэ цясней.

За перыяд, які прайшоў пасля XX з'езда, партыя ажыццявіла рад важных мер па далейшаму развіццю і ўмацаванню савецкай дэмакратыі, расшырэнню правоў саюзных рэспублік і мясцовых Саветаў, прафесіянальных саюзаў, разгортванню творчай ініцыятывы шырокіх мас працоўных у камуністычным будаўніцтве. Рэспубліканскія органы і мясцовыя Саветы самі пачалі вырашаць пытанні планавання, смялей

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы